**Білет 12**

**Практычнае заданне.**

**Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР. Сацыяльна-эканамічныя і палітычныя пераўтварэнні ў заходніх абласцях БССР.**

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні (выканайце заданні):**

1. Якое рашэнне прыняў Народны сход Заходняй Беларусі па пытанні аб дзяржаўным статусе заходнебеларускіх земляў?
2. Калі і дзе было прынята рашэнне аб прыняцці Заходняй Беларусі ў склад БССР?
3. Якія факты пацвярджаюць выснову аб тым, што ў дачыненні да беларусаў польскія ўлады праводзілі палітыку, якая парушала элементарныя правы і нацыянальную годнасць беларускага народа.
4. Складзіце план адказу на пытанне: "Змены ў галіне адукацыі, якія адбыліся ў заходняй Беларусі пасля ўз'яднання з БССР". Якую з іх вы лічыце найбольш важнай? Сваё меркаванне растлумачце.

**I. Картасхема. Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР.**



**II. Паход Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь.** *(па матэрыялах вучэбнага дапаможніка «Гісторыя Беларусі. 1917–пачатак XXI ст. 9 клас»)*

1 верасня 1939 г. нацысцкая Германія напала на Польшчу. Пачалася Другая сусветная вайна. Маючы вялізную перавагу ў жывой сіле і тэхніцы, германскія войскі акупіравалі значныя тэрыторыі Польшчы, у склад якой па ўмовах Рыжскага міру ўваходзіла Заходняя Беларусь. Былі заняты некаторыя заходнебеларускія населеныя пункты, у тым ліку горад Брэст.

Ва ўмовах наступлення германскіх войскаў па тэрыторыі Польшчы кіраўніцтва СССР прыняло рашэнне, паводле якога часткі Чырвонай Арміі перайшлі савецка-польскую граніцу. Паход пачаўся раніцай 17 верасня 1939 г. і быў сустрэты савецкімі людзьмі з адабрэннем.

Асноўная частка насельніцтва Заходняй Беларусі - сяляне, рабочыя, рамеснікі, інтэлігенцыя - сустракала Чырвоную Армію як вызваліцельніцу, з кветкамі ў руках і хлебам-соллю.

Народны сход Заходняй Беларусі прасіў Вярхоўны Савет СССР і Вярхоўны Савет БССР прыняць Заходнюю Беларусь у склад Савецкага Саюза і Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, уз'яднаць беларускі народ у адзінай дзяржаве і пакласці тым самым канец раз'яднанню беларускага народа….».

Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР аднавіла гістарычную справядлівасць у адносінах да беларускай нацыі, паклала канец паланізацыі часткі беларускага народа.

**III. Палітыка ў галіне адукацыі** *(па матэрыялах “СБ. Беларусь сегодня”)*

У 1932/33 навучальным годзе Віленская і Навагрудская беларускія гімназіі былі пераўтвораны ў філіялы польскіх. У 1934 г. гімназія ў Навагрудку ліквідавана. У Віленскім універсітэце на пачатку 1930-х гадоў доля студэнтаў-беларусаў складала 2,8% ад агульнай колькасці. У 1938/39 навучальным годзе не засталося ніводнай беларускай школы. Польскіх школ таксама было недастаткова, каб забяспечыць вучобу ўсіх дзяцей. У выніку на верасень 1939 г. 129,8 тыс. дзяцей школьнага ўзросту засталіся без навучання, гэта пераважна дзеці з беларускіх вёсак.

У адпаведнасці з Пастановай ЦК КП(б)Б "Аб мерапрыемствах па арганізацыі народнай адукацыі ў заходніх абласцях БССР" (1939 г.) у заходніх абласцях Беларускай ССР уводзілася ўсеагульная, абавязковая, бясплатная адукацыя: у гарадах - 7-гадовая, у сельскіх населеных пунктах - пачатковая. Партыйныя, савецкія органы і аддзелы народнай адукацыі былі абавязаны:

пераход на беларускія школы ажыццяўляць па меры забеспячэння школ падручнікамі і кваліфікаванымі выкладчыкамі-беларусамі;

разгарнуць прапагандысцкую і агітацыйную работу па ліквідацыі зняважлівага стаўлення да беларускай мовы, якое прывівалася кіруючымі коламі і нацыяналістычнымі элементамі ў Польшчы.

У 1940 г. былі адкрыты педагагічныя інстытуты ў Пінску, Беластоку, Баранавічах, Гродне і педагагічныя вучылішчы ў Беластоку, Гродне, Навагрудку, Брэсце, Пінску і Маладзечне, а таксама два дашкольныя педагагічныя вучылішчы ў гарадах Лідзе і Ваўкавыску.

У пачатку 1941 г. у заходніх абласцях БССР каля 170 тыс. дарослых наведвалі школы па ліквідацыі непісьменнасці.